БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
________ С.У. Абламейка
« 12 » февр... ______ г.
Рэгістрацыйны № УД- ______ /баз.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ ГІСТОРЫІ

**Вучэбная праграма установы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне**

**для спецыяльнасцей:**
**1-23 01 08-02 Журналістыка (аудыёвізуальная);**
**1-23 01 08-03 Журналістыка (вэб-журналістыка);**
**1-23 01 09 Журналістыка (журналістыка міжнародная)**

2013 г.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

**П.Л. Даращчонак** – дацэнт кафедры гісторыі журналістыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук;

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

**Н. В. Заяц** – дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
**А. К. Свораб** – дацэнт кафедры перыядычнага друку Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай гісторыі журналістыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(протокол №____ад «___»______________г.)

Вучэбна-метадычнай камісіяй Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № ___ ад «_____»__________________ г.)

Адказны за рэдакцыю: **П.Л. Даращчонак**
Адказны за выпуск: **П.Л. Даращчонак**

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма с/м «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» прызначана для першай ступені вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях: 1-23 01 08-02 Журналістыка (аудыёвізуальная); 1-23 01 08-03 Журналістыка (вэб-журналістыка); 1-23 01 09 Журналістыка (журналістыка міжнародная). Зыходнымі дакументамі для распрацоўкі вучэбной праграмы установы вышэйшай адукацыі па гэтай вучэбнай дысцыпліне дзяржаўнага кампанента з'яўляюцца адукацыйны стандарт і тыпавы вучэбны план установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях: 1-23 01 08-02 Журналістыка (аудыёвізуальная); 1-23 01 08-03 Журналістыка (вэб-журналістыка); 1-23 01 09 Журналістыка (журналістыка міжнародная) з улікам прынцыпу пераемнасці.

## Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны

Мэтай вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» з'ўляецца фарміраванне ў студэнтаў поўнай карціны развіцця гістарычных працэсаў на беларускай зямлі ў рэчышчы еўрапейскай і сусветнай гісторыі.

Для рэалізацыі гэтай мэты мяркуецца вырашэнне наступных задач:

- Засваенне студэнтамі сістэмы канцэптуальна-гістарычных ведаў, якія служаць рэтраспектывой для аналізу сучаснасці і вызначэння перспектыў будучай жыццядзейнасці;
- свядомае засваенне і прымяненне вучэбнай інфармацыі, звязанай з аналізам заканамернасцей і асаблівасцей гістарычнага развіцця беларускага этнасу;
- станаўленне выпускніка вышэйшай школы як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, здольнага якасна выконваць свой прафесійны абавязак.

## Месца дысцыпліны ў прафесійнай падрыхтоўцы выпускніка

Месца вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» ў цыкле агульнанавуковых і вгульнапрафесійных дысцыплін вызначаецца прадметам яе вывучэння, якім з'яўляюцца агульнасістэмныя заканамернасці і асаблівасці фарміравання беларускага этнасу, соцыўма, дзяржаўнасці ў працэсе ўзаемадзеяння розных сацыяльна-эканамічных і этнакультурных прадпасылак пад уплывам еўразійскіх цывілізацыйных і геапалітычных фактараў. У сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў для СМІ дысцыпліна з'яўляецца адной з базавых, дзе фарміруюцца ўяўленні аб асноўных паняццях гэтай сферы. Дысцыпліна «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» звязана з такімі курсамі, як «Гісторыя Беларусі», «СМІ як спецыялізаваная сістэма гістарычных крыніц». Яе вызначальнымі асаблівасцямі з'яўляюцца абноўлены змест, акцэнт на гістарычнае развіццё беларускага этнасу у рэчышчы славяна-праваслаўнага,

усходнееўрапейскага, расійскага, а таксама каталіцкага заходнееўрапейскага культурна-цывілізацыйных фактараў.

**Патрабаванні да засваення дысцыпліны ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам**

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен:

*ведаць:*

- змест паняцця гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі;
- этапы эвалюцыі айчыннай гісторыі і асноўныя праблемы развіцця беларускага соцыўму ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі;
- геапалітычныя фактары міжцывілізацыйнай прасторы, які займаў беларускі этнас (з улікам ролі нацыянальных меншасцей) у розныя гістарычныя эпохі;
- палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і культурныя прадпасылкі змены эпох;

*умець:*

- аналізаваць і прагназваць працэсы развіцця беларускага грамадства ў кантэксце сусветнай гісторыі, выкарыстоўваючы веды аб заканамернасцях гістарычнага развіцця;
- тлумачыць сутнасць заканамернасцяў і асаблівасцяў палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага і духоўнага развіцця беларускай дзяржавы ва ўмовах еўрапейскага рэгіёну і сусветнай супольнасці на розных гістарычных этапах;
- апрацоўвать і інтэрпрэтаваць фактычны матэрыял з улікам набытых ведаў;
- комплексна прымяняць веды па гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі на практыцы;

*валодаць:*

- метадамі пошуку, апрацоўкі, сістэматызацыі інфармацыі ў межах курса;
- тэхнікай работы з рознымі крыніцамі інфармацыі.

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | усяго | у тым ліку | |
| | | | лекцый | семинар. занятия |
| **1.** | Уводзіны | **2** | **2** | |
| **2.** | Спадчына старажытнага свету. Сярэднявечча і Беларусь | **2** | **2** | |
| **3.** | Станаўленне хрысціянскай цывілізацыі ў Еўропе і Беларусі (V – першая палова XIII ст.). | **4** | **2** | **2** |
| 4. | Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае (другая палова XIII - першая палова XVI ст.): ад Сярэднявечча да Новага часу. | **4** | 2 | 2 |
| 5. | Эканамічнае і палітычнае становішча Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай (другая палова XVI–XVII ст.) | **4** | 2 | 2 |
| 6. | Індустрыяльная цывілізацыя і Беларусь (канец XVIII – пачатак XIX ст) | **4** | 2 | 2 |
| 7. | Беларусь у перыяд Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. Станаўленне новага ўкладу жыцця | **4** | 2 | 2 |
| 8. | Беларусь у другой палове 1940-х – 1980-я гг. Абвяшчэнне суверэнітэту і дзяржаўнай незалежнасці Рэспублікі Беларусь | **4** | 2 | 2 |
| | Усяго | **28** | **16** | **12** |

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### 1. Уводзіны

Мэты і задачы спецыялізаванага модуля «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі». Гісторыя як навука. Роля гісторыі ў сучасным грамадстве. Адрозненне гісторыі ад прыродазнаўчых навук. Месца гісторыі сярод гуманітарных навук. Прадмет яе вывучэння, функцыі, крыніцы. Разнастайнасць гістарычных версій. Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы ў вывучэнні гісторыі. Праблема метадалогіі. Фармацыйны падыход К.Маркса (1818–1883). Сутнасць і паходжанне цывілізацыйнага падыходу. Вызначэнне цывілізацыі. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі. Змест і структура курса. Гісторыя Беларусі як аб’ект вывучэння. Агляд дапаможнікаў па гісторыі Беларусі. Версіі гісторыі Беларусі, выдадзеныя ў замежжы. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі як прадмет вывучэння. Літаратура і крыніцы. Мэты выкладання курса. Змест і структура курса.

### 2. Спадчына старажытнага свету. Сярэднявечча і Беларусь

Старажытныя цывілізацыі. «Вялікае перасяленне народаў» і Беларусь. Навука і рэлігія аб паходжанні чалавека. Даіндаеўрапейскі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі. Навука і рэлігія аб паходжанні чалавека. Міфалагічныя ўяўленні. Перыядызацыя гісторыі першабытнага грамадства. Даіндаеўрапейскі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі. Перыяд позняга (верхняга) палеаліта. Мезаліт. Неаліт. Неалітычная «рэвалюцыя». Першыя цывілізацыі. Узнікненне хрысціянства. Першыя перасяленні народаў. Узнікненне першых дзяржаў. Росквіт старажытных цывілізацый. Хрысціянства. Заняпад старажытных цывілізацый. Нашэсці варвараў і падзенне Рыма. Індаеўрапейцы. Пачатак рассялення славян на тэрыторыі Беларусі. Рассяленне індаеўрапейцаў. Славяне. Культура шнуравой керамікі. Зарубінецкая і пшэворская культуры. Анты і склавены. Пражская культура.

Пачатак рассялення славян на тэрыторыі Беларусі. Крывічы, дрыгавічы і радзімічы. Грамадскі лад і гаспадарчая дзейнасць.

### 3. Станаўленне хрысціянскай цывілізацыі ў Еўропе і Беларусі (V – першая палова XIII ст.).

Усталяванне хрысціянства і феадалізму ў Заходняй Еўропе. Уплыў Візантыі на ўсходніх славян. Прычыны заняпаду Рымскай імперыі, асноўныя рысы і перыядызацыя Сярэднявечча. Утварэнне хрысціянска-варварскіх дзяржаў у Заходняй Еўропе. Утварэнне Кіеўскай Русі – раннефеадальнай дзяржавы ўсходніх славян. Візантыйская імперыя і яе геапалітычнае становішча. Утварэнне Кіеўскай Русі – старажытнай усходнеславянскай

дзяржавы. Канцэпцыі паходжання Кіеўскай Русі. Нарманская тэорыя. Антынарманісты. Палітычны лад Кіеўскай Русі. Утварэнне першых беларускіх княстваў і іх палітычны лад. Тураўскае княства. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель. Духоўнае жыццё ўсходніх славян.

### 4. Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае (другая палова XIII - першая палова XVI ст.): ад Сярэднявечча да Новага часу

Эвалюцыя феадалізму і змены ў геапалітычнай сітуацыі ў Еўропе. Асаблівасці развіцця заходніх зямель Русі. Феадальная Еўропа. Феадальная раздробленасць на Русі. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя перадумовы фарміравання Вялікага княства Літоўскага. Перадумовы фарміравання ВКЛ. Канцэпцыі ўтварэння ВКЛ. Канцэпцыя «літоўскага заваявання». Канцэпцыя «Русі Літоўскай». Канцэпцыя «Літоўска-рускай дзяржавы». Канцэпцыя «Беларуска-літоўскай дзяржавы». Канцэпцыя «беларускай дзяржавы» («беларуская»). Канцэпцыя поліэтнічнай, беларуска-літоўскай або літоўска-беларускай, дзяржавы («цэнтрысцкая»).

Утварэнне ВКЛ, пашырэнне яго тэрыторыі, дынастычная барацьба. Пашырэнне тэрыторыі ВКЛ у XIV ст. Дынастычная і рэлігійная барацьба. Палітычная і прававая сістэма. Статуты ВКЛ. Вялікі князь. Паны-рада. Вялікі сейм. Пачатак кадыфікацыі права. Статуты ВКЛ. Судовая рэформа. Рэформа адміністрацыйнага ладу. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у складзе ВКЛ.Фарміраванне феадальных пазямельных адносін. Аграрная рэформа Жыгімонта II Аўгуста. Гарадская гаспадарка. Магдэбургскае права.

Месца і роля ВКЛ у гісторыі Еўропы XIV — першай паловы XVI ст. Час крызісаў і Адраджэння: кансалідацыя беларускай народнасці. Рэлігія, духоўнае жыццё і культура Беларусі.

Складванне агульнасці лёсу Еўропы. Рэнесанс і Рэфармацыя. Еўропа: агульнае і адметнае. Гаспадарка. Рэнесанс і гуманізм. Пераадоленне феадальнай раздробленасці. Вялікія геаграфічныя адкрыцці. Рэфармацыя і Контррэфармацыя.

Рэнесанс, Рэфармацыя і Контррэфармацыя ў Беларусі. Выдатныя дзеячы Адраджэння. Эпоха Адраджэння. Пратэстанцкі рух. Свецкая літаратура. Адукацыя. Архітэктура. Мастацтва. Езуіты ў Беларусі.

Фарміраванне беларускай народнасці. Паходжанне беларусаў. Асноўныя канцэнцыі этнагенезу беларусаў. Беларуская мова. Рэлігія. Менталітэт і этнічная самасвядомасць. Паходжанне назвы «Белая Русь».

### 5. Эканамічнае і палітычнае становішча Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай (другая палова XVI–XVII ст.)

Эканамічныя і палітычныя перамены ў Еўропе ў XVI–XVII стст. Пачатак Новага часу. Ад Сярэдніх вякоў да Новага часу. Зараджэнне капіталістычных адносін. Рэвалюцыі Новага часу. Утварэнне каланіяльнай сістэмы.

Утварэнне Рэчы Паспалітай (1569 г.) і статус ВКЛ у яе складзе. Барацьба за лідэрства ва Усходняй Еўропе. Люблінская унія. Месца ВКЛ у палітычнай сістэме Рэчы Паспалітай. Стварэнне ўніяцкай царквы. Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай, яе месца і роля ў еўрапейскай геапалітыцы таго часу. Экспансія на Усход. Трыццацігадовая вайна. Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг. Вайна 1654–1667 гг. Барацьба з асманскай агрэсіяй. Месца і роля Рэчы Паспалітай у еўрапейскай палітыцы XVI — XVII стст. Рэч Паспалітая ў еўрапейскіх канфліктах XVIII ст. Эпоха Асветніцтва: асветнікі і ідэі свабоды.

Асноўныя тэндэнцыі палітычнага і эканамічнага развіцця вядучых краін свету ў XVIII ст. Новы сусветны парадак. Утварэнне ЗША. Французская буржуазная рэвалюцыя. Пачатак прамысловага перавароту. Каланіяльная экспансія.

Грамадска-палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў XVIII ст.

Падзелы Рэчы Паспалітай. Паўночная вайна. Шляхецкая анархія. Гаспадарчае аднаўленне. Першыя спробы рэформаў. Вялікі сейм. Паўстанне Т. Касцюшкі. Дамова паміж Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй аб канчатковым падзеле Рэчы Паспалітай.).

Уплыў эпохі Асветніцтва на сусветную і айчынную культуру. Эпоха Асветніцтва. Айчынная культура напярэдадні эпохі Асветніцтва. Адукацыя. Навука. Першыя айчынныя свецкія тэатры. Архітэктура. Выяўленчае мастацтва.

## 6. Індустрыяльная цывілізацыя і Беларусь (канец XVIII – пачатак XIX ст).

Нараджэнне індустрыяльнай цывілізацыі і яе ўплыў на Беларусь. Прамысловая рэвалюцыя і пачатак зацвярджэння індустрыяльнага грамадства ў Заходняй Еўропе і ЗША. Палітычная мадэрнізацыя. Прамысловая рэвалюцыя і яе вынікі. Усталяванне «індустрыяльнага грамадства». Асаблівасці прамысловага перевароту і індустрыялізацыі ў Францыі і Германіі. Першы этап прамысловага пераварота ў Францыі (1790–1830). Другі этап прамысловага пераварота ў Францыі (1830–1840). Трэці этап прамысловага пераварота ў Францыі (1850–1860). Этапы прамысловага перавароту ў Германіі. Станаўленне эканомікі індустрыяльнага тыпу ў ЗША.

Асаблівасці пераходу да «індустрыяльнага грамадства» ў краінах Цэнтральнай, Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы. Палітычная мадэрнізацыя.

Палітыка царызму ў Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. Устанаўленне адміністрацыйнага падзелу і стварэнне органаў кіравання і суда. Палітыка царызму у адносінах да шляхты. Становішча сялянства і гараджан. Канфесійная палітыка царызму. Беларусь у вайне 1812 г. Напярэдадні вайны. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам 1812 г. Палітыка акупацыйнай адміністрацыі ў Беларусі. Ваенныя дзеянні ў Беларусі восенню 1812 г. Вынікі вайны.

Зараджэнне рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні ў грамадскім руху Беларусі. Тайныя таварыствы. Дзекабрысты ў Беларусі. Паўстанне 1830–1831 гг. і яго вынікі. Палітыка царызму ў Беларусі пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. Эканамічнае развіццё Беларусі ў перыяд крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Культурнае жыццё Беларусі ў першай палове XIX ст.

Беларусь у перыяд станаўлення буржуазнага грамадства. Барацьба за дэмакратыю і нацыянальнае адраджэнне (2-я палова XIX ст. – люты 1917 г.).

Сацыяльна-палітычнае развіццё Еўропы і ЗША ў другой палове XIX ст. Рэвалюцыя Мэйдзі ў Японіі. Дзяржаўна-прававая сістэма. Канстытуцыйная парламенцкая манархія. Прэзідэнцкая рэспубліка. Парламенцкая рэспубліка. Партыйная сістэма. Сацыялістычныя партыі. Кансерватыўныя партыі. Нацыяналістычныя партыі. Нацыянальнае аб’яднанне Італіі. Абвяшчэнне Германскай імперыі. Грамадзянская вайна ў ЗША. Рэфармацыя Мэйдзі.

Аграрная рэформа 1861 г. Прычыны правядзення рэформы. Паўстанне 1863 г. К. Каліноўскі. Ход паўстання. Сацыяльна-палітычныя вынікі паўстання. Буржуазныя рэформы 60–80 гг. і асаблівасці іх правядзення ў Беларусі. Контррэформы 80–90 гг. Земская рэформа. Гарадская рэформа. Судовая рэформа. Ваенная рэформа. Друк і адукацыя. Змены ў сельскай гаспадарцы. Беларуская прамысловасць. Крэдытная сістэма і банкі. Контррэформы. Народніцкі рух. Група «Гоман». Сацыял-дэмакраты. Фарміраванне беларускай нацыі.

Беларусь у часы рэвалюцыі 1905–1907 гг. і Першай сусветнай вайны. Паслярэвалюцыйная палітычная сітуацыя. Сталыпінская рэформа. Прамысловы ўздым і горад. Беларусь у Першай сусветнай вайне. Нямецкая акупацыя. Становішча на беларускіх землях, вольных ад нямецкай акупацыі. Звержэнне царызму. Адукацыя, навука і культура Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Адукацыя. Навука. Творчая дзейнасць. Культурная разнастайнасць Беларусі.

## 7. Беларусь у перыяд Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. Станаўленне новага ўкладу жыцця

Беларусь у перыяд Кастрычніцкай рэвалюцыі. Беларусь пасля звяржэння царызму. Дзейнасць агульнарасійскіх і нацыянальна-дэмакратычных партый. Паслярэвалюцыйная сітуацыя ў лютым-чэрвені 1917 г. Палітычнае жыццё пасля ліпеньскага крызісу. Кастрычніцкая рэвалюцыя. Устанаўленне савецкай улады ў Беларусі. Прыход да ўлады бальшавікоў. Усебеларускі з’езд. Супрацьстаянне бальшавіцкай улады і патрыятычнага падполля. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі, Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і Літоўска-Беларускай ССР. Савецка-польская вайна 1919–1920 гг. і яе вынікі. Міжнароднае становішча. Пачатак вайны і польская акупацыя. Беларускі рух. Завяршэнне вайны і яе вынікі. Беларускі рух супраць падзелу Беларусі.

Беларусь у міжваенны перыяд. Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін. Асаблівасці развіцця Еўропы і ЗША ў міжваенны

перыяд. Асаблівасці развіцця Еўропы ў міжваенны перыяд. Асаблівасці развіцця ЗША ў міжваенны перыяд. Новая эканамічная палітыка ў Беларусі. Эканамічны стан Беларусі ў пачатку 20-х гг. Нэп у Беларусі. Узбуйненне тэрыторыі рэспублікі. Ажыццяўленне індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў Беларусі. Індустрыялізацыя БССР. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі Беларусі.

Грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1920–1930-я гг. Грамадска-палітычная сістэма. Фарміраванне аднапартыйнай сістэмы. Унутрыпартыйная барацьба. Разгром беларускага нацыянал-дэмакратызму. Палітычныя рэпрэсіі 1930-х гг. Канстытуцыя БССР 1937 г.: адлюстраванне змен і супярэчнасцей.

Заходняя Беларусь у складзе Польшчы. Эканамічнае і палітычнае становішча. Прамысловасць Заходняй Беларусі. Сельская гаспадарка. Нацыянальна-вызваленчы рух і палітычная барацьба. Узброеная і палітычная барацьба. Беларуская сялянска-работніцкая грамада. Санацыя. Беларускі пасольскі клуб «Змаганне». Таварыства беларускай школы. Праблемы стварэння адзінага антыфашысцкага фронту. Роспуск КПЗБ. Культурнае і духоўнае жыццё савецкай Беларусі. Развіццё адукацыі і навукі. Беларуская літаратура. Тэатр. Музычнае мастацтва. Кіно.

Беларусь у гады Другой сусветнай вайны. Абвастрэнне супярэчнасцей паміж вядучымі краінамі свету. Спробы стварэння ў Еўропе сістэмы калектыўнай бяспекі. Антыкамінтэрнаўскі пакт. Мюнхенская змова. Савецка-германскі дагавор аб ненападзенні і сакрэтны дадатковы пратакол аб размежаванні «сфер ўплыву».

Пачатак Другой сусветнай вайны. «Дзіўная вайна». «Катынская трагедыя». Вайна з Фінляндыяй. Траісты пакт. Вызваленне Заходняй Беларусі і яе аб’яднанне з БССР. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Ваенныя дзеянні ў 1941–1945 гг. Партызанская барацьба на тэрыторыі Беларусі. Вызваленне Беларусі, яе страты ў Другой сусветнай вайне.

## 8. Беларусь у другой палове 1940-х – 1980-я гг. Абвяшчэнне суверэнітэту і дзяржаўнай незалежнасці Рэспублікі Беларусь

Беларусь у перыяд супрацьстаяння сусветных звышдзяржаў. Ялцінска-Патсдамская сістэма міжнародных адносін і передзел свету. Ялцінская канферэнцыя. Патсдамская канферэнцыя. Утварэнне сусветнай сістэмы сацыялізму. Канфрантацыя паміж сусветнымі дзяржавамі. Пачатак «халоднай вайны». «Дактрына Трумэна» і «план Маршала». Раскол Еўропы.

Змены ў геапалітычнай сітуацыі ў свеце ў 1960–1980-я гг. Тэндэнцыі сусветнага развіцця. Пачатак заходнееўрапейскай інтэграцыі.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў 1940-я – першай палове 1980-х гг. Нарастанне застойных з’яў. Савецкае грамадства ва ўмовах пасляваеннай разрухі. Стан народнай гаспадаркі. Спробы рэфармавання народнай гаспадаркі ў 50–60-я гг. НТР. Структура прамысловасці і кірункі яе развіцця. Асаблівасці НТР у Беларусі. Узрастанне застойных з’яў у

прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 1940-х – пачатку 1980-х гг. Асноўныя тэндэнцыі развіцця савецкага грамадства. Палітычныя і адміністрацыйныя рэформы 1950–1960 гг. Узмацненне палітычнага дыктату ў 60-я гг. Асноўныя дасягненні ў развіцці навукі, адукацыі і культуры Беларусі ў 1945–1985 гг. Адукацыя і навука БССР у 1945–1985 гг. Літаратура і мастацтва.

Да новай мадэлі грамадскага ладу. Спробы мадэрнізацыі краіны. Палітыка перабудовы. Распад сацыялістычнага лагера. Пачатак працэсу дэмакратызацыі ў БССР. Галоснасць у Беларусі. Перавыбары саветаў. Узнікненне новых палітычных партый. Змены ў духоўным жыцці. Моўная праблема. Змены ў адукацыі. Літаратура ў гады перабудовы. Тэатральнае жыццё.

Беларусь на міжнароднай арэне (1944–1990 гг.). Асноўныя этапы знешнепалітычнай дзейнасці БССР у 1944–1990 гг. Пашырэнне кампетэнцыі саюзных рэспублік СССР у галіне знешняй палітыкі. Спагнанне рэпарацый з Германіі і іх выкарыстанне ў БССР. Дзейнасць Беларусі ў ААН і яе арганізацыях. Беларусь – адна з краін-заснавальніц ААН. Дапамога Беларусі з боку ААН. Супрацоўніцтва ў межах ААН. Міждзяржаўнае супрацоўніцтва і грамадскія сувязі. Афіцыйныя візіты і грамадскія міжнародныя сувязі. Пабрацімскія сувязі. Культурныя, навуковыя, турысцкія і спартыўныя сувязі. Знешнеэканамічныя сувязі Беларусі. Вытворчая кааперацыя. Пачатак перабудовы і рэфармавання міжнародных сувязяў Беларусі.

Шлях да суверэнітэту і дзяржаўнай незалежнасці Беларусі (1990–2013 гг.). Радыкальныя змены ў палітычным, эканамічным і культурным жыцці Беларускага народа. Абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту БССР. Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Эвалюцыя палітычнай сістэмы Рэспублікі Беларусь. Рэферэндумы 1995 і 1996 гг. Трансфармацыя эканамічнай сістэмы Беларусі, крызіс і стабілізацыя. Асноўныя прычыны і праявы крызісу ў эканоміцы Беларусі. Замаруджванне спаду вытворчасці і паступовае яе нарошчванне. Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2001–2005 гг. і ход яе выканання. Змены ў духоўным і культурным жыцці беларускага народа. Развіццё адукацыі і навукі. Новы этап у развіцці беларускай мастацкай культуры.

Рэспубліка Беларусь у сусветнай супольнасці (1990–2013 гг.). Беларусь і СНД. Утварэнне СНД. Мінск – сталіца СНД. Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі. Супрацоўніцтва з Расіяй і іншымі краінамі СНД. Міжнародныя эканамічныя, навуковыя і культурныя сувязі Беларусі ў 1991–2013 гг. Знешнеэканамічныя сувязі. Навуковыя і культурныя сувязі.

Заключэнне. Асноўныя вынікі і ўрокі гістарычнага развіцця Беларусі. Заканамернасці і адметнасці гістарычнага развіцця Беларусі. Гістарычныя адметнасці вышэйшага парадку. Адметнасці сярэдняга парадку. Адметнасці ніжэйшага парадку.

Традыцыйнае і новае ў гісторыі. Асноўныя вынікі гістарычнага развіцця Беларусі. Асноўныя ўрокі гістарычнага развіцця Беларусі.

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### ЛІТАРАТУРА

1. Беларускія летапісы і хронікі. Мн., 1997.
2. Белоруссия в эпоху феодализма: Сб. документов и материалов: В 4 кн. Мн., 1969–1972.
3. Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Сб. документов и материалов: В 2 т. Мн., 1957.
4. Вішнеўскі А.Ф., Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1998.
5. Восстание в Литве и Белоруссии 1863 г. М.,1955.
6. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944 гг.): Документы и материалы: В 3 т. Мн., 1973–1988.
7. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 1. Старажытная Беларусь. Мн., 2000; Т. 3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.). Мн., 2004.
8. Калиновский К. Из печатного и рукописного наследия. Мн., 1998.
Кастусь Каліноўскі. За нашу вольнасць: Творы, дакументы / Склад. Г.Кісялёў. Мн.,1999.
9. Полное собрание русских летописей. Т.32. Белорусско-литовские летописи. М.,1975.
10. Полное собранне русских летописей. Т.36. Белорусско-литовские летописи. М.,1980.
11. По воле народа: Из истории образования Белорусской ССР и создания Коммунистической партии Белоруссии. Мн., 1988.
12. Программы политических партий России: Конец XIX – начало XX в. М.,1995.
Статут Вялікага княства Літоўскага. 1588: Тэкст. Даведнік. Каментарый. Мн., 1989.
Уния в документах: Сб. документов н материалов / Сост. В.А.Теплова. Мн., 1997.

**Абавязковая**

13. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941–1945: Энцыкл. Мн., 1990.
Галенчанка Г.Я. Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. Мн., 1993.
14. Гуревич Ф.Д. Древние города Белорусского Понемонья. Мн., 1982.
15. Доўнар-Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі, Мн., 1994.
16. Дебидур. Дипломатическая история Европы: В 2 т. Ростов н/ Д., 1995.
17. Жак А., Бендер И., Иржи Г. и др. История Европы. М.;Мн., 1996.
18. Ермаловіч М.І. Старажытная Беларусь: Навагрудскі перыяд: Гістарычны нарыс. Мн., 1990.
19. Ігнатоўскі В.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1991.
20. История политических партий России / Под ред. А.М.Зевелева. М., 1994.
21. История Европы: В 4 т. М., 1987–1993.
22. История России с древнейших времен до 1861 г. / Под ред. Н.Н. Павленко. М.,1998.
23. Ладысеў У.Ф., Брыгадзін П.І. Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.). Мн., 2003.
24. Нарысы па гісторыі Беларусі: У 2 ч. / Пад рэд. М.П. Касцюка. Мн., 1994–1995.
25. Марцуль Г.С., Сташкевіч М.С. Гісторыя Беларусі, насельніцтва, фарміраванне і вызначэнне этнічных і дзяржаўна-адміністрацыйных межаў, беларускае замежжа. Мн., 1997.

26. Новейшая история Отечества. XX век / Под ред. А.Ф. Киселева, Э.М. Щагина. М.,1998.
27. Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции: В 3 т. / Под ред. Э.М.Энтнна. Гомель, 1993.
28. Пашута В.Т., Фроня Б.Н., Хорошкевич А.Л. Древнерусское наследие и исторические судьбы восточных славян. М.,1982.
29. Праз смугу стагоддзяў. Мн., 1993.
30. Политическая история России / Под ред. В.В.Журавлева. М.,1998.
31. Пилипенко М.Ф. Возникновение Белоруссии. Мн., 1991.
32. Рыбаков Б.А. Киевская Русь и русские княжества XII–XIII вв. М.,1982.
33. Седов В.В. Славяне в древности: В 2 т. М., 1994.
34. Семенникова Л.П. Россия в мировом сообществе цивилизаций. М.,1994.
35. Страницы истории Компартии Белоруссии: Суждения, аргументы, факты. Мн., 1990.
36. Тойнби А. Дж. Постижение истории. М.,1991.
37. Тэйлар А.Д. Борьба за господство в Европе. М.,1998.
38. Фроянов М.Я. Киевская Русь: Очерки социально-политической истории. Л.,1980.
39. Францыск Скарына і яго час. Мн., 1988.
40. Федоров В.А. История России. 1861–1917. М.,1998.
41. Штыхов Г.В. Города Белоруссии по летописям и рукописям (IX–XIII). Мн., 1975.
42. Шчакаціхін М.М. Нарысы гісторыі беларускага мастацтва. Мн., 1993.
43. Щапов Ю.А. История России. XX век. М.,1988.
44. Цітоў А.К. Гарадская геральдыка Беларусі, Мн., 1989.
45. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 1991–1998. Т. 1–4.
46. Этнаграфія беларусаў: Гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя. Мн., 1985.
47. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. Мн., 1989.
48. Яковец А. История цивилизаций. М.,1995.
49. Ясперс К. Смысл и назначение истории. М., 1994.

**Спіс дадатковай літаратуры**

50. Адамушка У.І. Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі. Мн., 1994.
51. Адраджэнне: Гістарычны альманах. Мн., 1995. Вып.1.
52. Алексеев Л.В. Полоцкая земля в IX–XIII вв. М.,1966.
53. Бич М.О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861–1904 гг. Мн., 1983.
54. Бохан Ю.М. Войска ВКЛ у другой палове XIV – канцы XVI ст. Мн., 2002.
55. Верт Н. История Советского государства. М., 1998.
56. Галубовіч В.І. Эканамічны стан, побыт і гандаль Старажытнай Беларусі. Мн., 1997.
57. Голенченко Г.Я. Идейные и культурные связи восточно-славянскнх народов в XVI – середине XVII в. Мн., 1989.
58. Голубович В.И. Экономическая история Беларуси. Мн., 2003.
59. Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. Мн., 1971–1975.
60. Греков М.Б. Восточная Европа и упадок Золотой Орды. М., 1975.
61. Грузицкий Ю.Л. История развития денежно-кредитной системы Беларуси. Мн., 2002.
62. Игнатенко И.М. Февральская буржуазно-демократическая революцня в Белоруссии. Мн., 1986.
63. Игнатенко И.М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии. Мн., 1992.
64. Ігнаценка І.М. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі. Мн., 1995.

65. История рабочего класса Белорусской ССР: В 4 т. Мн., 1984–1987.
66. Круталевич В.А. История Беларуси: Становление национальной государственности. Мн., 1999.
67. Ластоўскі В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі. Мн., 1992.
68. Лосинский Н.Б. Революциюнно-демократическое движенне в Белоруссии (1870–1884). М., 1983.
69. Лютый А.М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – первой половнне XIX в. Мн., 1987.
70. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. Мн., 1996.
71. Насевіч В.Л. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: падзеі і асобы. Мн., 1993.
72. Палітычныя партыі Беларусі. Мн., 1994.
73. Пашута В.Т. Образованне Литовского государства. М., 1989.
74. Петриков П.Т. Ревкомы Белоруссии. Мн., б.г.
75. Полуян В А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939гг.). Мн., 1978.
76. Публицистика белорусских народников / Под ред. С.Х. Александровича. Мн., 1983.
77. Самусік А.Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. Мн., 2001.
78. Сасим А.М. Промышленность Беларуси в XX столетии. Мн., 2001.
79. Спиридонов М.Ф. Закрепощение крестьянства Белоруссии (XV–XVI вв). Мн., 1993.
80. Сташкевич Н.С. Приговор революции, крушение антнсоветского движения в Белоруссии (1917–1925). Мн., 1985.
81. Туронак Ю. Беларусь под немецкой оккупацией, Мн., 1993.
82. Тарасов К. М. Память о легендах белорусской старины: Голоса и лица. Мн., 1990.
83. Ткачоў М. А. Замкі і людзі Мн., 1991.
84. Турук Ф.Ф. Белорусское движение: Очерки истории национального и революционного движения белорусов. Мн., 1921; Мн., 1993.
85. Цвікевіч А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. Мн., 1993.
86. Шалькевич В.Ф. Калиновский: Страницы истории. Мн., 1989.
87. Шаповал Г.Ф. История туризма. Мн., 1999.
88. Штыхов Г.В. Древний Полоцк. Мн., 1975.
89. Шыбека 3. Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзяў), Мн., 1997.
90. Шыбека 3.В., Шыбека С.Ф. Мінск: Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада. Мн., 1994.
91. Эканамічная гісторыя Беларусі. Выд. 3-е, дап. і перапрац. / Пад рэд. праф. В.І. Галубовіча. Мн., 1999.
92. Экономическая история Беларуси. Изд. 3-е, доп. и перараб. / Под ред. проф. В.И. Голубовича. Мн., 2004.
93. Экономическая история зарубежных стран. Изд. 3-е, доп. и перараб. / Под ред. проф. В.И. Голубовича. Мн., 2002.
94. Юхо Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мн., 1992.

## ПЕРАЛІК
## рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі
## вынікаў вучэбнай дзейнасці

У пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці па дысцыпліне ўваходзяць:

- заданні на лабараторных работах
- кантралюемыя самастойныя работы
- тэставыя заданні
- падрыхтаваная студэнтамі прэзентацыя вынікаў вывучэння дысцыпліны на аснове электроннага партфоліа

Рэкамендаванымі сродкамі дыягностыкі могуць выступаць вусныя і пісьмовыя апытанні, заданні практычнай накіраванасці.